Прэм'ера

# Місія — не забываць

**У Маладзёжным тэатры эстрады прайшоў прэм'ерны паказ гістарычнай меладрамы «Без тэрміну даўнасці». Рэжысёр-пастаноўшчык — мастацкі кіраўнік тэатра, драматург, уладальніца медаля Францыска Скарыны Уладзіслава АРЦЮКОЎСКАЯ. У аснове сюжэта — падзеі Вялікай Айчыннай вайны.**



Уладзіслава Ігараўна расказвае, што ідэя звароту да такога матэрыялу ўзнікла пасля прагляду перадачы «Лісты вайны», дзе адзін з герояў успамінаў пра свайго таварыша і яго гісторыю. Ён быў ваенным контрразведчыкам, які зусім нічога не ведаў пра лёс сваёй сям'і — жонкі і дзвюх маленькіх дачок. Але аднаго дня 1944 года яму пашчасціла апынуцца на радзіме. Суседзі распавялі, што дзяўчынак немцы забралі ў лагер, дзе ў дзяцей забіралі для параненых салдат вермахта кроў, а жонка загінула. Тады галоўны герой разумее, што ён застаўся зусім адзін, і цяперашняй яго місіяй становіцца ваяваць за Перамогу, каб астатнія мелі надзею жыць. Падчас вызвалення польскага канцлагера контрразведчык знайшоў сваю жонку жывой і вырашыў шукаць дзяцей. Па ўсіх дакументах дзяўчынкі лічыліся загінулымі. Герой не здаецца, вядзе расследаванні і выходзіць на след нямецкай праграмы Le Bens Born, паводле якой дзяцей арыйскай знешнасці адсылалі для германізацыі. У выніку яму ўдаецца адшукаць нямецкую сям'ю, якая ўдачарыла яго дзяцей, і вярнуць іх.

Назва «Без тэрміну даўнасці» нясе глыбокі сэнс.

— Ёсць такое выслоўе, маўляў, усё забудзецца, пабудуюцца новыя гарады, пачнецца новае шчаслівае жыццё. Але галоўны герой, маёр Святлоў, ваенны контрразведчык, кажа: «Не, забываць нельга, інакш усё паўторыцца зноў». Гэта наша важная місія — не забываць. Важна, каб гэтыя фатаграфіі зноў ажывалі, нагадвалі пра мінулае, — адзначае рэжысёр.

Дзеянне ў спектаклі пачынаецца са старога здымка на экране, а далей кожная фотакартка дапаўняецца персанажамі. Падзеі і здымак на вачах гледачоў быццам ажываюць. На працягу ўсёй пастаноўкі складваецца ўражанне, што мы адкрылі і гартаем альбом, дзе кожны фотаздымак нясе за сабой цэлую гісторыю.

— Гэта было зроблена з мэтай нагадаць пра мінулае. Бо мы, сучаснікі, гледзячы на старыя фатаграфіі, успрымаем іх як частку нейкай далёкай гісторыі. А нам хацелася, каб гэтыя гісторыі жылі, каб глядач у зале адчуваў увесь боль, горыч і пакуты з гэтых фотаздымкаў, нібы стаў удзельнікам тых падзей.

Распавядаючы аб складанасці ажыццяўлення ідэі, Уладзіслава Ігараўна адзначае, што яшчэ задоўга да прэм'еры пачала шукаць архіўныя даныя і перачытала вялікую колькасць літаратуры на тэму ваеннай контрразведкі. Далей важным і хвалюючым этапам сталі пошукі музычнага суправаджэння.

— Мы вельмі доўга з кампазітарам Аляксандрам Сухаравым падбіралі музыку, але ўсё было не тое. А па задуме музыка павінна звязаць 15 розных месцаў дзеяння.

Усё да дэталяў узаемазвязана паміж сабой і дапаўняе акцёрскую ігру. Дамінантным адценнем быў абраны колер сепія, як аказалася, не проста так. Ён, як і музыка, аб'ядноўвае і месцы дзеяння, і дэкарацыі, і нават касцюмы герояў. Што датычыцца персанажаў, то капітана Дзмітрыевіча іграе Уладзімір Варанкоў, фраў Мадэр — Аляксандра Гайдук. А ў галоўнай ролі маёра Святлова задзейнічаны два артысты: на прэм'еры яго ўвасобіў Арцём Пінчук, а ў другім складзе будзе выступаць Руслан Чарнецкі.

— Першы сур'ёзны досвед пастаноўкі ў нас быў з мюзіклам «Гур'янаў» — гісторыя аб праваслаўным святары-старцы. Калі мы пачыналі яго рабіць, ніхто не верыў, што нешта атрымаецца, таму што маладзёжны тэатр эстрады асацыіруецца са спектаклямі, жанрамі больш вясёлымі. А мы ўзялі высокадухоўную тэму. Трэба сказаць, я дзейнічала з асцярожнасцю, бо не ведала, як гэта ўспрымуць акцёры. Але ўсё атрымалася, хоць я не сумнявалася, што менавіта гэтыя людзі змогуць выдатна сыграць і перадаць усю ідэю...

І ў новай пастаноўцы акцёры таксама ярка раскрываюцца ў сваіх ролях. А завяршаецца спектакль словамі, што няма гэтым падзеям тэрміну даўнасці і ніколі не будзе, а важная місія кожнага з нас — не забываць, быць саўдзельнікамі захавання памяці і дазваляць ажываць старым фотаздымкам.

**Вераніка КУХАРЧЫК,**
**фота аўтара.**